# РЭЦЭНЗІІ

## ДАКРАНУЦЦА ДА ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ НАРОДА…

*Леванцэвіч, Л. В. Дыялектная анамастыка: мянушка як від антрапонімаў : манаграфія / Л. В. Леванцэвіч ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2025. – 140 с.*

Манаграфія Л. В. Леванцэвіч «Дыялектная анамастыка: мянушка як від антрапонімаў» – вынік шматгадовай навукова-даследчай працы па зборы і сістэматызацыі дыялектнага анамастычнага матэрыялу Брэсцка-Пінскага Палесся. Упершыню ў беларускім мовазнаўстве даследавана дыялектная анамастыка Брэсцка-Пінскага Палесся – неафіцыйныя антрапанімічныя адзінкі (мянушкі). Выбар рэгіёна абумоўлены яго гісторыка-культурным значэннем, недастатковай ступенню даследавання, устойлівасцю анамастыкону, адсутнасцю комплексных даследаванняў анамастычнага і этналінгвістычнага характару. Даследаванне адбываецца ў сінхранічна-дыяхранічным аспекце, што абумоўлена зменамі ў анамастычным фрагменце лексікону.

Асаблівую значнасць у гэтым кантэксце ўяўляюць анамастычныя адзінкі, якія рэпрэзентуюць інфармацыю аб этнічнай гісторыі народа, сацыяльным жыцці, матэрыяльнай і духоўнай культуры дадзенага рэгіёна Беларусі. Брэсцка-Пінскае Палессе вызначаецца самабытнасцю культуры, гісторыі, мовы. Названыя асаблівасці рэгіёна знайшлі сваё адлюстраванне ў моўных адзінках. Сістэматызацыя мянушак, зробленая аўтарам, дапаможа вызначыць заканамернасці развіцця рэгіянальнай анамастыкі (антрапанімікі) Брэсцка-Пінскага Палесся. Даследаванне мае важнае значэнне таксама для вывучэння фанетычных, граматычных і лексічных асаблівасцей гаворак, адлюстраваных у мянушках.

У першай главе «Асноўныя пытанні рэгіянальнай моўнай карціны свету» даследуецца моўная карціна Брэсцка-Пінскага Палесся, сфарміраваная ў штодзённай свядомасці моўнага калектыву і адлюстраваная ў моўных адзінках.

Онімы як нацыянальны іменнік насельнікаў Брэсцка-Пінскага Палесся складаюць анамастычны ладшафт, выступаюць часткай лексіка-семантычнай сістэмы беларускай мовы. Аўтарам вызначаны лінгвакультурныя асаблівасці рэгіянальных моўных адзінак.

У другой главе «Мянушка як антрапанімічная катэгорыя» разглядаецца мянушка як від антрапоніма, як антрапанімічная катэгорыя.

У трэцяй главе «Матывацыйны і семантычны аспекты даследавання мянушак» падаецца тэматычная класіфікацыя мянушак Брэстчыны, асвятляюцца пытанні гісторыі ўзнікнення мянушкі; прапануецца семантычная класіфікацыйная схема з улікам матывацыі, вобразнасці, семантыкі, суаднесенасці з анамастычнай і апелятыўнай лексікай, колькаснага складу намінантаў.

У чацвёртай главе аўтарам даследуюцца мянушкі-характарыстыкі, асацыятыўныя мянушкі, апелятывы – асацыятары мянушак, саматызмы як аб’екты намінацыі і інш. Асобным прадметам аналізу сталі мянушкі жывёл як складнік анамастычнай прасторы Брэстчыны.

Навуковая значнасць манаграфіі Л. В. Леванцэвіч у тым, што яна дасць магчымасць ацаніць суадносіны анамастычнай сістэмы літаратурнай мовы з дыялектнай, выявіць намінатыўныя тэндэнцыі, уласцівыя ў цэлым анамастычнай практыцы, вызначыць перспектывы далейшага вывучэння дыялектнага анамастыкону мянушак як віду антрапонімаў.

Манаграфія Л. В. Леванцэвіч «Дыялектная анамастыка: мянушка як від антрапонімаў» будзе карысна не толькі выкладчыкам і навучэнцам устаноў вышэйшай адукацыі, але і настаўнікам агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў усім, хто цікавіцца моўнай і духоўнай культурай Брэсцка-Пінскага Палесся.

***Мікалай Рыгоравіч Гарбачык,***
*кандыдат філалалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры методык дашкольнай і пачатковай адукацыі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*